Дзве зоркі

Сто сорак год таму назад,
На небе зоркі дзве з’явіліся.
Не ведаў з нас ніхто,
Што гэта зоркі двух сыноў
Так ярка запаліліся.

Прамені зорак асвятлялі
Народу шлях з-за цемнаты.
І родным словам заклікалі
Людзей выходзіць з беднаты.

Прамені зорак асвятлялі
Рачулкі, курганы, лясы.
І тыя дарогі,
Якія дахаты вялі.

Свяцілі ўдзень і ўночы,
Хацелі святла паўсюль,
Каб была ў сялян надзея
На ясны заўтрашні дзень.

І жылі зоркі надзеяй,
І снілі свае яны сны.
І бачылі святло і радасць
У снах сваіх.

Гэта зоркі Купала і Коласа
Глядзелі на нас з нябёс,
Свяцілі ярчэй за іншых
Прамені вось гэтых зор.

І вечна гарэць зоркі будуць
Пра паэтаў напамінаць.
Ніколі іх не забудуць
І вякамі ўспамінаць.

Шкробат Галіна Васільеўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА «Асавецкая сярэдняя школа
Мазырскага раёна» Гомельскай вобласці